УДК 94 (476)

# Лютаўская рэвалюцыя і развіццё беларускай тэатральнай самадзейнасці ў 1917 г.

Шчаўлінскі М.Б.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г., абудзіўшы магутныя крыніцы творчай энергіі беларускага народа, выклікала шырокае развіццё беларускай тэатральнай самадзейнасці. Паўсюль, дзе была нацыянальна-свядомая беларуская інтэлігенцыя і ініцыятыўная моладзь, пачалі з'яўляцца розныя культурна-асветныя гурткі.

У 1917 г. у Мінску арганізоўваецца маладзёжны гурток «Вянок», які праз некаторы час быў рэарганізаваны ў агульнанацыянальнае таварыства «Беларуская вучнеўская грамада», якое складалася з некалькіх гурткоў, нйбольшую актыўнасць сярод якіх праяўляў драматычны пад кіраўніцтвам А. Андрэева. Гэты самадзейны калектыў выступаў са спектаклямі ў «Беларускай хатцы», дзе паказаў мінскаму гледачу песу Я. Коласа «Антось Лата», А. Чэхава «Мядведзь» і інш.

У мястэчку Будслаў быў заснаваны культурна-асветны гурток «Вяночак». Яго першым спектаклем была мініяцюра Валодзькага «Як яны жыніліся». Затым былі пастаўлены «Паўлінка», «Па рэвізіі» і інш.

Найбольш актыўны рух вясковай тэатральнай самадзейнасці ў 1917 г. назіраўся на Случчыне. Шырокую вядомасць набыла тут культурна-асветная арганізацыя «Папараць-кветка», арганізатарм і кіраўнікам якой з'яўляуся Ф.Шаптыра. Арганізацыя мела тры гурткі: краязнаўчы, роднай мовы, і літаратуры і драматычна-харавы. Асаблівай папулярнасцю ў гледачоў карыстаўся драматычна-харавы гурток. Для першага свайго спектакля ўдзельнікі драматычнага гуртка абралі купалаўскую «Паўлінку», вельмі блізкую і зразумелую ім сваёй народнасцю і паэтычнасцю. Потым гурток падрыхтаваў яшчэ некалькі пастановак. Аднак дзейнасць гуртка не абмяжоўвалася толькі паказам спектакляў для гарадскога гледача. Не менш увагі ўдзялялі і вёсцы. «Папараць-кветка» на працягу 1917 г. стварыла широкую сетку сваіх гкрткоў-філіялоў у вёсках. Найбольш буйнымі былі гурткі «Зарніца» ў в. Старыца пад кіраўніцтвам А. Калпака, «Крыніца» ў в. Засялонне пад кіраўніцтвам А. Аніхоўскага, гурток «Зорка» ў в. Ліпнікі, Сухая Міля пад кіраўніцтвам М.Дубіны.

Увосень 1917г. узнікла некалькі драматычных гурткоў на Чэрвеньшчыне. Найбольш цікавую работу на вёсцы праводзіў драматычны гурток пал кіраўніцтвам настаўніцы П. Мядзёлкі ў Пагарэльскай воласці. Там не толькі паказвалі спектаклі, але і сістэматычна наладжвалі вечарынкі, на якіх спявалі беларускія песні, танцавалі, чыталі вершы.